А. І. Лакотка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2016. – Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. – Кн. 2. Духоўная культура. – С. 196 – 227.
11. Шарая, В. Каляндарныя абрады ўшанавання продкаў у традыцыйнай культуры беларусаў: праблемы і перспектывы даследавання / В. Шарая // Acta Albaruthenica. – Warszawa, 2018. – Т. 18. – S. 317 – 332.
12. Шарая, О. Н. «Куст (Ку́ста) водой не обливали» (к вопросу о семантике западнополесского обряда «вождения Ку́ста») / О. Н. Шарая // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2019. – Вып. 26. – С. 342 – 348.
13. Шарая, О. Н. «Куст – только на Троицу» (о времени проведения календарного обряда «вождения Ку́ста») / О. Н. Шарая // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2020. – Вып. 28. – С. 357 – 363.
14. Шарая, О. Н. Теоретико-методологические проблемы изучения празднично-обрядовой традиции белорусов в условиях культурных изменений / О. Н. Шарая // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2021. – Вып. 29. – С. 450 – 456.
15. Шейн, П. В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края : в 3 т. / П .В. Шейн. – СПб. : Тип. Имп. Академии наук, 1887. – Т. 1, ч. 1. Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – 586 с.

РЕЗЮМЕ

В статье рассмотрен троицкий празднично-обрядовый комплекс белорусов с учётом региональных и локальных особенностей. Выявлены общие составляющие этого комплекса и особенные. Показано, что народная традиция, приуроченная к Троице, включала как широко распространённые, так и регионально-специфические элементы.

SUMMARY

The Belarusian’s Trinity festive and ritual complex is considered, taking into account some regional and local features. Some common and special components of this complex have been identified. It is shown that the Trinity folk tradition included both widespread and regionally specific elements.

***Шатарава М. А.***

# СУТНАСЦЬ, СПЕЦЫФІКА І СКЛАД БЕЛАРУСКАЙ АКАЗІЯНАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ Ў ПРЫЗМЕ ЧАСУ

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка*
*(Паступіў у рэдакцыю 11.03.2021)*

Беларускія традыцыйныя абрады былі звязаны з усімі сферамі быцця чалавека, яны рэгулявалі паўсядзённае і святочнае жыццё, вызначалі паводзіны людзей у розных сітуацыях. У дадзеным комплексе важнае месца займаюць station аказіянальныя абрады, якія ўзнаўляюцца не рэгулярна, а толькі пры неабходнасці ці ўзнікненні асаблівых, часцей крытычных, крызісных акалічнасцей. Аказіянальная абраднасць характарызуецца своеасаблівым часам выканання (па неабходнасці) і накіравана на магічнае ўздзеянне на прыродныя і «іншыя», звышнатуральныя, сілы з мэтай змянення крытычнай або крызіснай сітуацыі ў жыцці соцыуму. Аказіянальныя абрады маглі

пераходзіць на іншы ўзровень (у групу каляндарных абрадаў) у выпадку іх правядзення ў пэўны дзень календара у памяць пра пераадоленне крызісу і з мэтай яго далейшага недапушчэння.

Аказіянальная абраднасць знаходзілася ў ракурсе ўвагі даследчыкаў фальклору ўжо з XIX ст. Асобныя праяўленні аказіянальных абрадаў былі сабраны класікамі фалькларыстыкі, але разглядаліся ў рэчышчы каляндарнай або сямейнай абраднасці. Шматлікія варыянты абрадаў выклікання і спынення дажджу былі зафіксаваны П. Шпілеўскім, Е. Раманавым, П. Шэйнам і яго карэспандэнтамі, каштоўны матэрыял сабраны А. Сержпутоўскім, М. Нікіфароўскім, Д. Зяленіным. Праблеме даследавання аказіянальнай абраднасці ў кантэксце ўсёй славянскай культуры прысвяцілі свае працы расійскія даследчыкі М. і С. Талстыя, К. Чыстоў, Г. Любімава, А. Фурсава і іншыя. У працы беларускага фалькларыста У. Васілевіча «Беларускія народныя прыкметы і павер'і» ў трох кнігах («Зямля стаіць пасярод свету...», «Жыцця адвечны лад» і «Зямная дарога ў вырай») сабраны і сістэматызаваны каштоўны фальклорны матэрыял, які змяшчае абрады, рытуалы, звычаі, прыкметы, павер'і і іншыя жанры, што ўяўляюць сабой традыцыйную культурную спадчыну беларускага народа [2 – 4]. У навуковых працах беларускіх даследчыкаў М. Антропава, Т. Валодзінай, С. Санько, У. Лобача аказіянальныя абрады разглядаюцца ў кантэксце іншых відаў абраднасці або ўсёй традыцыйнай культуры.

Аказіянальная абраднасць уяўляе сабой значны пласт беларускай традыцыйнай абраднасці, які ўтрымлівае ўяўленні і спадзяванні нашых продкаў, іх вераванні і нормы паводзін, звязаныя з асаблівасцямі рэакцыі чалавека на тыя з'явы і падзеі, што парушалі звыклы ход яго жыцця і вызначаліся як крызісныя. Станоўчае вырашэнне гэтых асаблівых крызісных ці крытычных сітуацый дасягалася пры дапамозе звароту да звышнатуральных магчымасцей прыроды і іншых людзей. Беларуская аказіянальная абраднасць заснавана на першабытных анімістычных вераваннях, на адчуванні чалавекам сваёй залежнасці ад прыроды і дзейнасці «іншых сіл», на якія немагчыма зрабіць пэўнае практычнае ўздзеянне. Такім чынам, узнікалі разнастайныя магічныя спосабы, тэксты, рытуалы, што суправаджалі кожны жыццёвы этап і былі заклікаюць дапамагчы калектыву ў яго барацьбе за дабрабыт. Аказіянальная абраднасць захавала найбольшую колькасць язычніцкіх элементаў, такіх як рытуалы ахвярапрынашэння, ачышчэнне вадой, культ сонца, магічныя заклінанні і г. д. З цягам часу абрады змяняліся, узбагачаліся, асімілявалі ў сабе элементы іншых культурных уздзеянняў. Аднак семантыка аказіянальнай абраднасці захавалася амаль у нязменным выглядзе.

Беларуская аказіянальная абраднасць характарызуецца шматлікімі спецыфічнымі прыкметамі, якія вызначаюць яе адметнасць.

1. Адной з вызначальных прыкмет з'яўляецца прычына правядзення абрадаў дадзенага тыпу: узнікненне крызісу, які мог датычыцца не толькі асобнага чалавека, але і ўсяго калектыву. Крызісная сітуацыя магла быць звязана з разнастайнымі сферамі жыцця чалавека, аднак заўсёды яна

выклікала парушэнне жыццёвага рытму, змяненне звыклага ладу. Чалавек не мог уздзейнічаць на сітуацыю звычайнымі практычнымі сродкамі, традыцыйны вопыт падказваў яму зварот да рытуальных спосабаў вырашэння праблемы. Абрадавыя дзеянні, якія выкарыстоўваліся пры ўзнікненні крызісу ў жыцці чалавека, былі накіраваны на зварот да прыродных сіл і стыхій, свету продкаў, Бога і хрысціянскіх святых з надзеяй на іх спрыянне.

2. Вера ў абавязковую дзейснасць правядзення аказіянальнага абраду з'яўляецца яго стрыжнем, вызначыўшы кансерватыўнасць шматлікіх элементаў.

3. Магічны характар аказіянальнага абрадавага дзеяння значна ўплывае на характарыстыку самога абраду, што вызначалася ў шанаванні культаў (продкаў, сонца, стыхій), веры ў звышнатуральныя магчымасці прадметаў і некаторых людзей.

4. Асноўнымі функцыямі правядзення аказіянальных абрадаў з'яўляюцца ахоўная і ачышчальная. Рытуальныя дзеянні і тэксты былі накіраваны на абарону чалавека і яго маёмасці ад небяспечных прыродных з'яў і крызісных бытавых і сацыяльных сітуацый. Напрыклад, «ахавальным сродкам супраць перуноў лічылі бярозавыя галінкі з палявых алтароў, пастаўленых на свята Божага Цела» [3, с. 72]. Ачышчэнне ў аказіянальнай абраднасці ўяўлялася вынікам выгнання «чужых» сіл са «сваёй» тэрыторыі пры дапамозе магічных уласцівасцей прадметаў, тэкстаў, незвычайных здольнасцей асобных людзей.

5. Для аказіянальнай абраднасці характэрны своеасаблівы характар працякання абрадавага часу, што звязана, па-першае, з выкананнем дадзенага віду абраднасці па ступені неабходнасці (у выпадку наступлення ці пагрозы крызісу); па-другое, з пэўнымі пагранічнымі (крытычнымі) момантамі правядзення абрадавых дзеянняў: поўдзень, поўнач, захад сонца, цэлыя суткі.

6. Правядзенне аказіянальных абрадаў вызначаецца сінтэзам сімвалічных дзеянняў, вербальных, драматычных і іншых элементаў. Кожны элемент выконвае вызначаную задачу і цесна ўзаемазвязаны з іншымі. З прыходам хрысціянства аказіянальная абраднасць узбагацілася такімі элементамі, як удзел святароў у абрадах, выкарыстанне абразоў, чытанне малітваў і асвячэнне святой вадой, служэнне малебнаў і арганізацыя хрэсных хадоў. Пры гэтым нязменнымі застаюцца такія язычніцкія элементы, як культ сонца, зямлі, агню і вады, выкарыстанне язычніцкіх сімвалаў і знакаў, надзяленне асаблівымі магчымасцямі людзей пэўнага статусу (маладых цнатлівых людзей, старых, удоў, цяжарных жанчын, блізнят і г. д.), ахвярапрынашэнне (сімвалічнае або рэальнае).

7. У сувязі з рознымі прыроднымі ўмовамі, спосабамі вядзення гаспадаркі і стасункамі з жыхарамі бліжэйшых краін у аказіянальных абрадах рэгіёнаў адзначаецца палiварыянтнасць правядзення абрадавых дзеянняў, адметны набор атрыбутаў, адрозненні вербальнага кампанента.

Для аказіянальных абрадаў характэрна трывалая ўзаемасувязь паміж кампанентамі: вербальнымі тэкстамі і словамі, складам выканальнікаў, іх

рытуальнымі дзеяннямі, выбарам месца для правядзення, выкарыстаннем матэрыяльных рэчаў і жывых істот.

Вербальны кампанент аказіянальных абрадаў увабраў у сябе такія магічныя тэксты, як прыгаворы, заклінанні, замовы, славесныя формулы, якія выкарыстоўваліся ў мэтах звароту да тых сіл, што павінны былі аказаць магічнае ўздзеянне на змяненне крызіснай сітуацыі. На станаўленне і развіццё вербальных тэкстаў вялікі ўплыў аказала хрысціянства. У значнай меры хрысціянская рэлігія ўзбагаціла аказіянальны вербальны кампанент і абрады ў цэлым новымі хрысціянскімі вобразамі (Хрыста, Маці Божай, святых), новай формай выканання, аднак сутнасць тэкстаў засталася нязменнай па сваёй функцыянальнай накіраванасці: яны павінны былі садзейнічаць спыненню крызісу і ўсталяванню звыклага ходу жыцця.

Аказіянальныя абрады складаліся з асобных дзеянняў, якія ўяўлялі сабой рытуальныя рухі, што выконваліся з магічнымі мэтамі. Дзеля таго, каб сітуацыя змянілася ў лепшы бок, неабходна было сімвалічна паказаць станоўчы вынік. Такім чынам, сімвалічнае прайграванне выйсця з крызісу ва ўяўленні людзей магло выклікаць сапраўдную падобную і жаданую рэальнасць. Магічная функцыя аказіянальных абрадаў абумоўлівала накіраванасць рытуальных дзеянняў на сімвалічнае размежаванне «свайго» і «чужога» свету, на перасцярогу і недапушчэнне пранікнення і ўмешвання ў жыццёвыя працэсы «іншых» негатыўных сіл. Гэта выяўляецца ў такіх асаблівасцях абрадавых дзеянняў, як выкананне руху па коле, крыж-накрыж, асвячэнне вадой і г. д. Змяненне крызіснай сітуацыі вызначалася некалькімі асаблівымі момантамі: высвятленнем прычыны крызісу, правядзеннем магічных рытуалаў, накіраваных на пазбаўленне ад вынікаў крытычнай сітуацыі, ачышчэннем «сваёй» жыццёвай тэрыторыі, умацаваннем межаў паміж «сваім» і «чужым» светам. Гэтыя этапы суправаджаліся абрадавымі дзеяннямі, якія вызначаліся ачышчальнымі і зберагальнымі функцыямі.

Вялікае значэнне ў аказіянальных абрадах мела выкарыстанне атрыбутаў. Прадметы і жывыя істоты выконвалі ў рытуальных дзеяннях своеасаблівыя ролі, адметнасцю якіх з’яўляецца іх сувязь з прыроднымі стыхіямі (хлебная лапата супраць навальніцы – вызначаецца паралель паміж нябесным агнём (маланкай) і зямным (агонь у печы) і г. д.). Шырокае распаўсюджванне ў аказіянальных абрадах атрымаў рытуал ахвярапрынашэння, звязаны са зваротам да спрыяння «іншых» сіл. Ахвярай мог быць прадмет або жывая істота, якую прыносілі ў дар дзеля дасягнення асноўнай абрадавай мэты – спынення крызісу. З прыходам хрысціянства ў аказіянальных абрадах з’явілася шмат царкоўных атрыбутаў, што маглі выкарыстоўвацца з нехрысціянскімі мэтамі.

Выбар месца правядзення аказіянальнага абраду быў абумоўлены спецыфікай крызіснай сітуацыі, а таксама сакральным сэнсам рытуальнай пляцоўкі, абрадавыя дзеянні праводзіліся каля водных аб’ектаў (ракі, возера, крыніцы, калодзежа), на палях, дарогах, перакрыжаваннях і г.д.

Спецыфіка адбору ўдзельнікаў абрадаў заключалася ў асаблівым сацыяльным статусе чалавека. Часцей галоўнымі выканаўцамі аказіянальных

абрадаў станавіліся прадстаўнікі абшчыны, якія вызначаліся рытуальнай чысцінёй, што абумоўлівала ўдзел дзяцей, маладых дзяўчат і хлопцаў, а таксама ўдоў, салдатак, старых людзей. Такія патрабаванні былі звязаны з неабходнасцю магічнага ўздзеяння абраду, што дасягалася семіятычным характарам усіх абрадавых кампанентаў. Удзел маладых і цнатлівых дзяўчат або хлопцаў побач са старымі людзьмі ўяўляў сабой сімвалічнае падабенства да дзвюх фаз жыцця (маладосць – сталасць), што мела сакральны сэнс пры правядзенні аказіянальных абрадаў. Уплыў хрысціянства на выбар выканаўцаў абрадаў вызначаўся ў тым, што ў правядзенні рытуальных дзеянняў сталі прымаць удзел духоўныя асобы, якія занялі вядучую пазіцыю.

Такім чынам, абрадавыя кампаненты ў сваёй сукупнасці былі накіраваны на магічнае ўздзеянне на прыродную стыхію або з’яву, звязаную з прычынай з’яўлення крызіснай сітуацыі, з мэтай змянення парушэнняў рытму існавання чалавека ў свеце і ўладкавання гарманічнага жыцця.

Спецыфіка аказіянальных абрадаў цесна звязана з характэрнымі асаблівасцямі асноўнай прычыны іх правядзення: крызіснай ці крытычнай сітуацыі, якая можа датычыцца розных сфер жыцця – прыродных з’яў, здароўя чалавека ці свойскай жывёлы, бытавых сітуацый. У залежнасці ад гэтага можна ўмоўна вылучыць аказіянальныя абрады: метэаралагічныя, звязаныя са здароўем, бытавыя, звязаныя з сацыяльнымі крызісамі.

Метэаралагічныя аказіянальныя абрады праводзіліся падчас узнікнення катаклізмаў надвор’я, небяспечных для чалавека і яго гаспадаркі. Выкананне абрадаў, якія павінны былі ўздзейнічаць на прыродныя з’явы, звязвалася з шанаваннем людзьмі дзвюх стыхій – воднай і агнявой. Гэта вызначала спецыфіку абрадаў у дачыненні да выкарыстання прадметаў, што мелі сімвалічнае дачыненне да вады або агню, выканання рытуальных тэкстаў са зваротам да названых стыхій (або канкрэтных прыродных з’яў), правядзення абрадавых дзеянняў, накіраваных на наладжванне магічных сувязяў паміж зямнымі і нябеснымі эквівалентамі воднай і агнявой стыхій і г. д.

Аказіянальныя абрады праводзіліся з нагоды сітуацый, звязаных са здароўем чалавека або свойскай жывёлы, і ў большасці мелі ачышчальны характар. Яны былі накіраваны на абарону сваёй жыццёвай тэрыторыі ад уплыву іншых сіл, у выглядзе якіх уяўлялася хвароба. Абрады выконваліся з выкарыстаннем спецыяльных магічных сродкаў, закліканых ачысціць чалавека і яго жылую прастору, а таксама садзейнічаць далейшаму нераспаўсюджванню крызіснай сітуацыі. З гэтай мэтай ужываліся рытуальныя рэчы, якія мелі сакральны сэнс (напрыклад, «абыдзённы» ручнік), абрадавыя дзеянні, накіраваныя на сімвалічнае абмежаванне тэрыторыі хаты, двара або вёскі і г. д.

Правядзенне бытавых аказіянальных абрадаў было звязана з узнікненнем крызісных сітуацый, якія датычыліся гаспадарчай дзейнасці чалавека. Паколькі ў такіх абрадах цэнтральнае месца займала жылая прастора, што нібы ўвасабляла неабходныя ўмовы для існавання, то яе абарона і забеспячэнне камфорту становяцца асноўнымі абрадавымі функцыямі. Істотную ролю ў правядзенні бытавых аказіянальных абрадаў

адыгрываў рытуал прынясення ахвяры, які павінен забяспечыць станоўчыя адносіны іншых сіл і іх дапамогу ва ўсталяванні і падтрыманні жыцця на неабходным узроўні. Уплыў хрысціянскіх традыцый выявіўся ў тым, што ў бытавых аказіянальных абрадах сталі шырока выкарыстоўвацца царкоўныя атрыбуты і тэксты. Змяненне формы выканання і ў гэтым выпадку не прывяло да змянення сутнасці: абрадавыя дзеянні былі накіраваны на забеспячэнне перамогі над крызіснай сітуацыяй пры дапамозе звароту да вышэйшых сіл.

Сярод сацыяльных крызісаў асабліва цяжкімі для насельніцтва былі ваенныя дзеянні, якія перыядычна праходзілі на тэрыторыі Беларусі. Абрадавыя дзеянні і тэксты, што выконваліся ў крызіснай сітуацыі, былі звязаны з ахоўнай і ачышчальнай функцыямі і рэалізоўваліся праз магічнае замыканне прасторы (хаты, двара, вёскі), калектыўнае ўздзеянне (кансалідацыя намаганняў), ахвяраванне (аброчная тканіна, нітка, ручнік, хлеб) вышэйшым сілам.

Гісторыя бытавання аказіянальнай абраднасці вызначае яе шматлікія змяненні, звязаныя з разнастайнымі прычынамі: неаднаразовай зменай рэлігійных уяўленняў людзей, неабходнасцю прыстасавання духоўнай культуры да сацыяльных і палітычных умоў, пашырэннем навуковых ведаў пра прыродныя з’явы і працэсы, глабалізацыяй і інфарматызацыяй культуры. Гэтыя фактары ўплывалі на трансфармацыю аказіянальнай абраднасці, якая ўключала некалькі накірункаў: змяненні атрыбутыўнага апарату, функцыянальнай накіраванасці, сферы бытавання абрадаў, узмацненне драматызацыі. Істотнае пераўтварэнне аказіянальных абрадаў садзейнічала знікненню некаторых кампанентаў, а таксама пераходу захаваных элементаў у іншыя жанры беларускага фальклору, у прыватнасці, у дзіцячыя прыгаворы, прыпеўкі, заклічкі і іншыя.

Аказіянальная абраднасць змяшчае ў сабе элементы розных культурных пластоў, якія садзейнічалі развіццю і ўзбагачэнню абрадавай культуры. Аднак працэс трансфармацыі абрадаў быў звязаны таксама з такой з’явай, як страта магічнага сэнсу, што прывяло да фактычнага знікнення аказіянальнай абраднасці са сферы актыўнага ўжытку.

Для вербальнага кампанента беларускай аказіянальнай абраднасці характэрны такія жанры, як галашэнні, малітвы, песні, прыгаворы, заклінанні, замовы. Напрыклад, паэтыка беларускіх галашэнняў багатая на разнастайныя выяўленчыя сродкі, яны эмацыянальна насычаныя: *«Мая ты жабачка, мая ты квакушачка, усюды ты лазіш, усюды поўзаіш. Ты такая мокрынькая... Дай нам дожджычку, як сама мокрынькая!»* [5, с. 76]. Магічным тэкстам уласцівы імправізацыйны характар, накіраванасць на пэўны аб’ект, у якасці якога мог выступаць сам крызіс («чужыя сілы») або заступнікі чалавека (хрысціянскія – Ісус Хрыстос, Маці Божая, святыя; язычніцкія – стыхіі, зоркі, сонца і г. д.), апісанне рытуальных дзеянняў ці сімвалічнага абыгрывання сітуацыі або выйсця з яе ў тэксце, а таксама матывы выгнання, аховы, ачышчэння ад злых сіл. Напрыклад, падчас пажару

традыцыйным з'яўляўся зварот да святых: *«Святы Нікалай, прыступі-памагі, / Ляці да неба, агонь, бяры пламя з сабой»* [6, с. 803].

У тэкстах беларускіх аказіянальных абрадаў шырока ўжываюцца эпітэты, параўнанні, увасабленне, персаніфікацыя, алітэрацыя, алегорыя, гіпербала, сімволіка лікаў і асабістых імёнаў, інтанацыйна-сінтаксічныя сродкі. Асаблівасці выканання вербальных тэкстаў аказіянальных абрадаў былі абумоўлены магічнай функцыяй. Гэта звязана з гучнасцю вымаўлення тэкстаў (вельмі гучна ці, наадварот, ціха), а таксама з трохразовымі паўторамі слоў або фраз. Некаторыя абрадавыя тэксты дайшлі да нашых дзён у трансфармаваным выглядзе, яны захаваліся ў дзіцячым фальклоры ў форме прыгавораў, прыпевак, заклічак і іншых жанраў: *«Сонейка, сонца, выгляні ў аконца, / Пасвяці нам трошку, дам табе гарошку»* [1, с. 358].

Такім чынам, аказіянальная абраднасць аб'ядноўвае абрадавыя дзеянні, рытуалы, нормы паводзін, магічныя і сімвалічныя вобразы, якія займалі ў жыцці чалавека вядучае месца падчас узнікнення асаблівых крызісных сітуацый: засухі, навальніцы, моцных маразоў, эпідэмій, пажараў, ваенных дзеянняў і г. д. Вывучэнне дадзенага тыпу абраднасці з'яўляецца вельмі перспектыўным, паколькі аказіянальныя абрады ўяўляюць сабой найбольш архаічны пласт традыцыйнай культуры, іх рэканструкцыя можа быць карыснай у межах даследавання ўсёй культуры. Вывучэнне аказіянальнай абраднасці раскрывае сутнасць і змест язычніцкіх уяўленняў, іх асэнсаванне дазваляе глыбей зразумець сістэму светаўяўлення старажытных беларусаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Дзіцячы фальклор / рэдкал.: К. П. Кабашнікаў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.

2. Жыцця адвечны лад: беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., перакл. У. А. Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1998. – Кн. 2. – 607 с.

3. Зямля стаіць пасярод свету...: беларускія народныя прыкметы і павер'і / уклад., прадм., перакл., бібліягр. У. А. Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – Кн. 1. – 591 с.

4. Зямная дарога ў вырай: беларускія народныя прыкметы і павер'і. / уклад., прадм., перакл., паказ. У. А. Васілевіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1999. – Кн. 3. – 475 с.

5. Раманава, Л. Абрад выклікання дажджу ў вёсках Чачэрскага, Кармянскага раёнаў Гомельскай вобласці / Л. Раманава // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці антраполага Зінаіды Мажэйкі) : зб. навук. прац удзельнікаў X Міжнар. навук. канф., Мінск, 29 красавіка – 1 мая 2016 г. / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў [і інш.]. – Мінск, 2016. – С. 74 – 76.

6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А. М. Боганева [і інш.] ; ідэя і агульн. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Вышэйшая школа, 2013. – Т. 6. Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн. – Кн. 2. – 1231 с.

РЕЗЮМЕ

В статье рассмотрена белорусская окказиональная обрядность в единстве специфических черт и проявлений. Раскрыты определяющие признаки и специфика компонентов окказиональной обрядности, проведена классификация белорусских окказиональных обрядов и обычаев согласно кризисным ситуациям, вызывающим их

проведение, очерчены особенности, причины и направления трансформации белорусских окказиональных обрядов в процессе исторического развития, определена жанровая специфика.

SUMMARY

The article considers the Belarusian occasional rite in the unity of specific features and manifestations. The defining features and specifics of the components of occasional rites are revealed, the classification of Belarusian occasional rites and customs according to the crisis situations that caused them is created, the peculiarities, reasons and directions of transformation of Belarusian occasional rites in the process of historical development are outlined.